

# ДА 60-ГОДДЗЯ ТАМАРЫ МІХАЙЛАЎНЫ МАЗУР

**Дарагая Тамара Міхайлаўна!**

Круглая дата ў жыцці – добрая нагода падвесці папярэднія вынікі. Хочацца верыць, што яны Вас радуюць. Ваша паэзія стала неад’емнай часткай культурнай спадчыны Беларусі. Створаны Вамі вобраз сучаснай беларускай жанчыны – мастацкае ўвасабленне якасцей сапраўднага патрыёта, самаадданай руплі́ўцы роднай культуры, вернай сяброўкі, шчаслівай маці і бабулі, надзейнай захавальніцы хатняга ачага. З-пад Вашага пяра выходзяць творы, для якіх характэрныя творчая мудрасць і грамадзянская сталасць, вернасць традыцыям і смелае, прагрэсіўнае мысленне – прыкметы сапраўднага майстра слова. Так трымаць! Сардэчна віншуем Вас з 60-годдзем. Жадаем Вам заўсёды бачыць святло надзеі, адчуваць радасць веры і цеплыню любові, якімі вы адорваеце тых, хто побач. Здароўя, шчасця, невычэрпнай энергіі жыцця і творчасці Вам, калега, на доўгія, доўгія гады. ***З ЮБІЛЕЕМ!***

*Калектыў*
*Гродзенскага абласнога аддзялення*
*Саюза пісьменнікаў Беларусі*

***30 лістапада 2024 года***
Гродна – Скідзель

